# «КАРАНІ І ВЕРШАЛІНЫ»

## міжнародны адукацыйны праект для маладых грамадзян Беларусі

Інстытут імя Гётэ ў Мінску ў супрацоўніцтве з Брытанскім Саветам і Французскім Альянсам пачынае новы адукацыйны праект для беларускай моладзі «Карані і вершаліны». Дадзены праект дае магчымасць прыняць удзел у бясплатных супер-інтэнсіўных курсах англійскай, нямецкай і французскай моў. Акрамя гэтага, яго ўдзельнікі змогуць наведаць шэраг еўрапейскіх краін і бліжэй пазнаёміцца са структурай Еўрапейскага Саюза і дзейнасцю яго інстытутаў. Фінансаванне дадзенага праекта ажыццяўляе Еўрапейскі Саюз.

***Мэты праекта***

- павышэнне ўзроўня валодання замежнай мовай – англійскай, нямецкай альбо французскай – з A2 да B2 у адпаведнасці з Агульнаеўрапейскімі кампетэнцыямі валодання замежнай мовай;
- непасрэднае знаёмства з краінай вывучаемай мовы;
- усталяванне прафесійных і асабістых кантактаў паміж моладдзю Беларусі і іншых еўрапейскіх краін.

***Да ўдзелу ў праекце запрашаюцца***

Маладыя людзі – грамадзяне Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 18 да 31 года, якія прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ўжо валодаюць выбранай замежнай мовай на ўзроўні A2 (студэнты; маладыя спецыялісты, праца якіх звязана з шырокім выкарыстаннем замежнай мовы; дзеячы культуры і навукі; дзяржаўныя служачыя і інш.).

***Праграма праекта***

- працягласць праекта – 2 гады;
- 6 краін-удзельніц: Беларусь, Вялікабрытанія, Германія, Літва, Польшча, Францыя;
- тры замежныя мовы: англійская, нямецкая і французская;
- 300 месцаў для навучання;
- 8 гадзін моўнай практыкі ў дзень на курсах у Мінску і Еўропе;
- культурная праграма ў Берліне, Кардзіфе, Страсбургу;
- заключная сустрэча ўсіх удзельнікаў праекта ў Вільнюсе.



***Ход рэалізацыі праекта***

**Нямецкая мова**

Да ўдзелу ў курсах нямецкай мовы адбіраюцца 45 чалавек у 2013 годзе. Праграма:

З 24 чэрвеня да 19 ліпеня – супер-інтэнсіўныя моўныя курсы ў Мінску.

З 4 да 31 жніўня - супер-інтэнсіўныя моўныя курсы ў Германіі (Брэмен, Дрэздэн, Швэбіш-Халь).

З 31 жніўня да 6 верасня – культурная праграма ў Берліне.

**Французская мова**

Да ўдзелу ў курсах французскай мовы адбіраюцца 45 чалавек у 2013 годзе. Праграма:

З 24 чэрвеня да 19 ліпеня – супер-інтэнсіўныя моўныя курсы ў Мінску.

З 18 жніўня да 14 верасня - супер-інтэнсіўныя моўныя курсы ў Францыі (Фрэжус).

З 15 да 18 верасня – культурная праграма ў Страсбургу.

**Англійская мова**

Да ўдзелу ў курсах англійскай мовы адбіраюцца 120 чалавек, якія будуць навучацца на працягу 2013-2014 гг. Праграма:

З 1 да 26 ліпеня 2013 года – супер-інтэнсіўныя моўныя курсы ў Кракаве.

Ліпень 2013 года – ліпень 2014 года – анлайн-курс англійскай мовы.

Ліпень 2014 года – супер-інтэнсіўныя моўныя курсы ў Польшчы (Кракаў/Варшава) і паездка 50 самых актыўных удзельнікаў у Кардзіф (Вялікабрытанія).

***Заключнае мерапрыемства***

У лістападзе 2014 года адбудзецца заключная сустрэча ўсіх 300 удзельнікаў праекта «Карані і вершаліны» ў Вільнюсе.

*Заяўкі на ўдзел у праекце «Карані і вершаліны» прымаюцца **да 15 красавіка 2013 года** ўключна. Усю падрабязную інфармацыю і фармуляры заявак Вы знойдзеце на сайце:*

**www.goethe.de/minsk**

Інстытут Імя Гётэ ў Мінску
вул. Веры Харужай, 25/3
220123 Мінск

Тэл. +375 (17) **23 77 119** альбо
+375 (17) **23 77 126**

www.goethe.de/minsk
Каардынатары праекта:
Ількевіч Наталля, Байэр Халіна



GOETHE INSTITUT Sprache. Kultur. Deutschland.
BRITISH COUNCIL
Alliance Française de Moldavie

# «КАРАНІ І ВЕРШАЛІНЫ»

## міжнародны адукацыйны праект для маладых грамадзян Беларусі



This project is funded by
the European Union